НАША БУДУЧЫНА

Цана асобнага нумару 200 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільна, Воотрабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць раз у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 800 м. п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад ня вертаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 400 мк., сярод тэксту 600 мк. і на апошняй страніцы 200 мк. за радок пэтыту ў 1 шпальт.

№ 2. Субота, 13-га студня 1923 г. Год II.

Па-над гранічнымі капцамі.

Кожнаму лёгка зразумець, якія вынікі могуць быць для жывога народу, якога дужэйшыя суседзі падзялілі між сабой, парэзаўшы ягоную зямлю на кускі. Аслабленьне тэй вялікай сілы, якую прадстаўляе еднасьць многамілёоннае грамады; патрэбна на кожным кусочку Бацькаўшчыны будаваць недасяжны гмах нацыянальнае культуры малымі, неадпаведаючымі велічы заданьня сіламі; немагчымасьць абменівацца думкамі і культурнымі цэннасьцямі, твораны сынамі аднаго народу за дзяржаўнымі межамі, што парэзалі Бацькаўшчыну гэтага народу,—вось галоўныя рэзультаты гэткага падзелу, ня кажучы ўжо аб цэлым сьцягу другіх.

Такія варункі жыцьця могуць найдужэйшы народ духова забіць і давясьці да поўнага культурнага упадку. А што сказаць аб народзе, які толькі што збудзіўся ад сталетняга сну, толькі-што выпраставаў сваю сьпіну, скінуўшы цяжкае ярмо рабства?

Такім народам зьяўляецца наш народ Беларускі, якога суседзі парэзалі на часьці, забраўшы ягонаю зямлю. Найвялікшая часьціна Беларусі асталася пад уладу Польшчы, ды яшчэ шматок апынуўся ў межах—Літоўскае і Латвійскае Рэспублікі.

Ня будзем тут затрымлівацца над тымі варункамі, у якіх нашаму народу даводзіцца жыць у межах Польшчы, Савецкай Беларусі, Літвы і Латвіі. У гэты мамэнт разгледзім пытаньне, як беларускаму народу трэба бароцца з нягоднымі для яго вынікамі разьдзелу ягонае Бацькаўшчыны.

Ведама, што ад Савецкае Беларусі мы цяпер аддзелены сапраўднай „Кітайскай сьцяной“. Ні Заходняя Беларусь, што пад Польшчай, ці пад Літвой, ні Наддзьвінскія землі Латвіі ня маюць магчымасьці падтрымліваць цясьнейшыя зносіны з Усходняй Беларусяй. А як яшчэ і між Польшчай ды Літвой і Латвія зносіны вельмі трудныя, дык яно і выходзе, што кожная частка Беларусі жыве зусім асобным жыцьцём і павінна сама сабе культурна здаволіваць.

Ды каб-жа толькі тое! А то ў кожнай дзяржаве, да якое прырэзалі па куску нашае Бацькаўшчыны, жыцьцё апіраецца на зусім іншых асновах: у Літве і Латвіі—на дэмакратычных, у Савецкай Беларусі—на соцыялістычных, у Польшчы—на паліцэйска-бюрократычных. Гэта, ведама, адбіваецца і на думках і паглядах насяленьня—асабліва на паглядах на права і закон. Адбіваецца яно і на ўсім сьветаглядзе народных масаў, а гэтым самым і на творчасьці іх. Вытвараецца асаблівая псыхалёгія зусім розная у літоўскага, латвійскага, расейскага і польскага беларуса. Сьледам за гэтым разьвіваюцца тут і там розныя асаблівасьці самае мовы. Калі так патрывае даўжэй, калі „Кітайскае сьцяны“ нам яшчэ доўга ня ўдасца пераступіць, дык мы, сыны аднаго народу, мабыць хутка перастанем разумець адны адных.—А гэта-ж для нашай нацыянальнай культуры, як вытвару усяго нашага народу, усё роўна, што сьмерць!

З гэтым у першую чаргу нам і трэба змагацца, і трэба змагчы гэта. Чым больш нас дзеляць, тым больш павінны мы імкнуцца да культурнае і духовае еднасьці беларусаў у-ва ўсіх дзяржавах. Бо прыйдзе такая часіна, калі рухне „Кітайская сьцяна“ і счэзьне штучны разьдзел нашага народу на кусочкі,—а тады ці ня будзем мы між сабой гаварыць рознымі языкамі, не разумеючы адны адных? Вось і трэба нам чым-больш рупіцца аб тое, каб у такі мамэнт мы не глядзелі адны на адных дзікімі вачамі, каб сустрэліся, як выпадае сынам адной маткі.

Як-жа гэтага мы дасягнем?

Адказ можа быць адзін: хай нашы думкі-мыслі, нашы ідэі і лятуценьні пралятаюць праз усе штучныя загарадкі, хай пранікаюць праз таўстыя сьцены „Кітайскай сьцяны“. Хай створыцца жывы абмен культурнымі цэннасьцямі, твораным[1] за кожным з гранічных кардонаў. Хай беларуская кніжка, ўсё роўна дзе друкаваная, пашыраецца на ўвеськім абшары, на якім жывуць беларусы. І гэтым мы будзем бараніцца ад духовага падзелу, да якога інакш нямінуча павінен давясьці падзел нашае тэрыторыі.

Стварэньне адзінага культурна-нацыянальнага фронту — вось найважнейшая задача сучаснага мамэнту. Гэту задачу беларускае грамадзянства ўсіх суседніх дзяржаваў і павінна як найлепей развязаць. Няхай кожны беларус, асабліва кожны беларускі грамадзянін і палітычны дзеяч пранікнецца глыбока думкай, што **для лёта духа беларускага няма гранічных капцоў**,—і на гэтым мы збудуем нашу нацыянальную еднасьць, нашу культурную суцэльнасьць, ня гледзячы на падзел нашае бацькаўшчыны Беларусі.

Просім усіх падпішчыкаў „Нашай Будучыны“ аднавіць падпіску і заахвочываць іншых да выпісываньня сваей газэты.

Мы верым, што сьвядомыя беларусы падтрымаюць „Нашу Будучыну“, каб гэтым даць магчымасьць пазнаць несьвядомым сьветлыя ідэалы працоўнага Беларускага Народу.

Зямля бяз выкупа.

Калі мы разглядзім пытаньне аб тым, хто папраўдзі з'яўляецца гаспадаром зямлі, дык прыдземо к яснаму вываду, што гаспадар зямлі, гэта той, хто на ёй працуе сваімі уласнымі рукамі, а калі ён перастае працаваць, зямля пераходзіць да таго, хто зноў бярэцца сам на ёй працаваць. А значыць толькі селянам-зёмляробам павінна быць перададзена зямля бяз выкупу. Бо толькі яны, адвечныя зямельныя працаўнікі з'яўляюцца і гаспадарамі зямлі.

І праўда, які жа гэта гаспадар абшарнік?!

Дзяды яго і прадзеды атрымалі зямлю ў сваю уласнасьць толькі дзякуючы таму, што ўмелі быць добрымі лёкаямі у каралёў польскіх і цароў расейскіх. Так, напрыклад, польскія каралі раздавалі беларускія землі тым сваім прысьпешнікам, якія пакідалі беларускую нацыянальнасьць, і як Юды за срэбранікі прадавалі палякам і сваю душу, і свой народ, адракаліся ад роднае мовы і рабіліся палякамі.

З другога боку, маскоўскія цары, далучыўшы Беларусь грабежствам да Расеі стараліся зрусіфікаваць край рознымі спосабамі. Аднакаж, памешчыкі ўжо былі апалячаны і дзеля таго цары прыдумалі другі шлях каленізацыі. Яны прысылалі на Беларусь цэлымі тоўпамі расейскіх чыноўнікаў, якія тутака атрымлівалі высокія пасады і багатыя маёнткі.

Тое самае мы бачым і цяпер калі на нашых вачох беларускія землі адбіраюцца ад малазямельных беларусаў і аддаюцца палякам—асаднікам. І палякі і расейцы глядзелі на Беларусь, як на калёнію і таксама стараліся, ды і цяпэрь стараюцца, абадраць тры скуры з нашаго народу, ям гэта робяць ангельцы над індусамі.

Землі беларускія пападалі ў рукі чужынцаў, якія ворожа адносіліся да ўсяго нашага роднага. Бедны сялянскі народ наш пры гэтым яшчэ дарма і працаваў на гэтых прыганятых. Бо паны і чыноўнікі атрымлівалі ня пустыя землі, а з вёскамі і з народам, які жыў у гэтых вёсках.

Дык ня толькі маральнага, але нават і юрыдычнага права ня маюць паны-абшарнікі на землі, якія папалі ў іх рукі шляхам уціску і душагубства. Гэта было грабежства, якое учыніў сільны над слабым. І нічым яны не хацелі нават аддзякаваць аграблены народ. Ні школ, ні бальніц, ніякага намеру на культурную працу сярод працоўнага сялянства ня бачыў наш народ ад паноў.

Сотні гадоў працаваў народ наш на гэтых паноў. Працуе ён і цяпер на іх, хаця ўжо добра зразумеў усю крыўду сваю векавечную, зразумеў, што не сяляне павінны плаціць за зямлю панам, а паны яшчэ застануцца даўжнікамі сялян. Пэўня, што паны будуць абараняць свае інтэрэсы ўсімі сіламі і бадай што дабром ды мірам яны маёнткі не аддадуць. Але дарма. Гісторыя робіць сваё. Выбары ў Сойм даказалі сьвядомасьць беларускага народу, даказалі, што і беларусы могуць дружна стаць у абароне сваіх правоў.

Але дабіваючыся нацыянальнага адраджэньня мы не навінны забываць на сацыяльныя пытаньні, з якіх самым важным для нас зямля бяз выкупу беларускаму сялянству.

Каб настаў хутчэй гэты час, трэба дружнай грамадой ісьці нам да нашых мэтаў. Трэба дружна утвараць грамадзянскія арганізацыі. Трэба падтрымліваць працай на месцох сваіх пасłоў у Сойме...

Ад нас самых залежыць наш дабрабыт.

Красавік.

Саюз Соцыялістычных Савецкіх Рэспублік.

30 сьнежня 1922 году — на самым канцы мінулага году — ў Савецкай Расеі зроблена вялікая і важная перамена.

Дагэтуль на руінах царскае Расеі істнавала Расейская Савецкая Фэдэрацыйная Соцыялістычная Рэспубліка. У склад яе, апрача Вялікарускае тэрыторыі, ўваходзіла вялікшая частка Беларусі і Украіны, Каўказ і др. часьціны калішняе імпэрыі цароў. Кожная з нацыянальных тэрыторый прадстаўляла як-быццам незалежную Рэспубліку з сваім Совнаркомам і ЦІК'-ам і лічылася сфэдэраванай з РСФСР—значыць, з Вялікарускай Рэспублікай, якая, аднак, не зьяўлялася роўным з другімі Рэспублікамі сябрам Фэдэрацыі, а была як бы гаспадаром у гэтай Фэдэрацыі: Совнарком і ВЦІК былі цэнтральнымі ўрадовымі ўстановамі і для Вялікарускае тэрыторыі, і для ўсіх сфэдэраваных нацыянальных Рэспублік.

Цяпер дзяржаўны гмах Фэдэрацыі перабудоўваюць: гэта ўжо не „Расейская“ Рэспубліка, а „Саюз Соцыялістычных Савецкіх Рэспублік“ з саюзным Совнаркомам і ЦІК'-ам. Саюзны ўрад складаецца з прадстаўнікоў усіх аб'яднаных нацыянальных Рэспублік,—а ў тым ліку стаіць і Вялікаруская Рэспубліка ўжо не як гаспадар над другімі, а як роўны сябра.

Праўда, склад цэнтральнага ўраду Саюза такі, што расейцы мецімуць у ім абсалютную большасьць галасоў. Да таго-ж цэнтральны ўрад будзе мець такія шырокія межы дзейнасьці, што Совнаркомам і ЦІК'-ам нацыянальных Рэспублік бадай нічога да самастойнай работы не астанецца. Розьніца ў палажэньні Савецкае Беларусі будзе толькі тая. што раней з кожнай справай яна павінна была зварачацца да маскоўскага Совнаркому, як „прасіцель“, а цяпер прадстаўнікі яе—хоць і зусім малой лічбы—будуць засядаць у Совнаркоме Саюза, як роўныя з другімі сябры яго.

Цэнтралізацыя ўсяе ўрадовае дзейнасьці ў руках Совнаркому „Саюза Соцыялістычных Рэспублік“ тлумачыцца эканамічнымі вымаганьнямі. Якія вынікі такой цэнтралізацыі будуць для нацыянальных рэспублік,—пакажа жыцьцё, але ўжо цяпер узьнімаюцца ў нашым грамадзянстве даволі трывожныя думкі аб нашай нацыянальнай будучыні ў Саюзе.

Прадстаўнікі савецкае ўлады завяраюць, што дзеля трывогі нямашака ніякага грунту. Не ўваходзячы ў крытыку гэтых заяў, мы дзеля бесстароннасьці даем ім тутака месца.

Заява Сталіна.

На пытаньне карэспандэнта „Праўды“, ці Саюз Соцыялістычных Савецкіх Рэспублік не вядзе да поўнага зьліцьця нацыянальных Рэспублік з Масквою, ці апошняя не праглыне іх дзякуючы сваей перавазе ў саюзным урадзе, народны камісар па нацыянальных справах Сталін заявіў, што ніколі ня можа стацца.

— „Гэтыя Рэспублікі,—сказаў Сталін,—утварыліся, як натуральны вынік развіцьця адпаведных нацыянальнасьцей, маючы ў аснове галоўным чынам нацыянальную адзнаку... Нацыянальныя Рэспублікі ня могуць быць зьніштожаны, ня могуць быць пазбаўлены свайго ЦІК'-а і Совнаркому, сваей нацыянальнай асновы, пакуль істнуе нацыянальная мова, нацыянальная культура, быт звычаі.“

Заява А. Чарвякова.

Прадседацель ЦІК'а Беларусі і сябра прэзыдыума Саюзу Савец. Сацыялістыч. Рэспублік А. Чарвякоў знаходзіць

у новаствораным Саюзе выгады для Савецкіх рэспублік з боку зносін з капіталістычнымі дзяржавамі і ў справе заграцічнага гандлю. Што да адносін шырокіх беларускіх мас да Саюзу, дык яны выразна вызначыліся на Усебеларускім зьездзе ў карысьць Саюзу.

Ня спыненае разьвіцьцё працы беларусізацыі, як друкаваньне беларускіх кніг, субсыдаваньне беларускага тэатру і інш., аканчальна развеела агітацыю шовіністычных элемэнтаў, якія хацелі бачыць у Саюзе небасьпеку для беларускае культуры.

Усім падпішчыкам газэта высылаецца рэгулярна, -- хто не атрымлівае, няхай паведамляе аб гэтым адміністрацыю газэты.

З газэт.

„Укрываньне праўды.“

Пад гэткім загалоўкам „Rzeczpospolita“ піша:

„Калі два гады таму назад на вуліцах Варшавы зьявіліся прапагандныя афішы процi бальшавізму, на якіх у цыфрах быў дадзены абраз дарагоўлі ў Савецкай Расеі, раўнуючы да тагачасных цэн у нас, — людзі чыталі іх з некаторым аблягчэньнем.

„Чыталі тамака: у Расеі фунт хлеба каштуе каля 300 руб., пара ботаў 20.000 і г. д., ды цешыліся, што ў нас усё-ткі ня так ужо блага... Бо фунт хлеба ў нас каштаваў тады колькінадцаць марак, а пара ботаў — некалькі сот...

„Ніхто тады не спадзяваўся, што цэны прадуктаў першае патрэбы узрастуць у нас гэтак зусім па-бальшавіцку— на некалькі сот працэнтаў і ня толькі зраўняюцца з тагачаснымі цэнамі ў Савецкай Расеі, але йшчэ і перарастуць іх. Аднак, гэта сталося ў працягу двух гадоў.

„І цяперака дайшло да таго, што цэны, якія былі ў Савецкай Расеі два гады таму назад, здаюцца нам—раўнуючы да цяперашніх цэн у нас — вельмі нізкімі.

„Можна мець уражаньне, што ў хуткім часе мы ўжо перагонім савецкі рэкорд дарагоўлі“.

У канцы газэта зварачае ўвагу на тое, што ўрад укрывае істотнае палажэньне, бо ўрадовая камісія да досьледаў над узростам цэн аблічае ўзрост дарагоўлі ў месяцы сьнежні на 35,08 працэнтаў, а запраўды цэны ўзрасьлі прынамся на 100 працэнтаў.

Аб самаупраўленьні.

Каб нас ня крыўдзілі, каб нашы жаданьні ў адносінах да беларускае асьветы спаўняліся, патрэбна правесьці на мяйсцох арганізацыю такім спосабам, каб у мяйсцовым самаўпраўленьні былі свае людзі. Патрэбна салідная агітацыя, каб у гмінныя рады ды ў павятовыя соймікі прайшлі свае людзі, зусім сьвядомыя беларусы. Гэта бязумоўна патрэбна, бо ня можна ні на мінуту забывацца, што па істнуючых цяпер законах аб мяйсцовым самаўпраўленьні, гмінныя рады і павятовыя соймікі маюць правы ў пэўных межах пастанаўляць аб усіх мяйсцовых справах у граніцах сваіх раёнаў. Праўда і гмінныя рады і павятовыя соймікі ў нас, на беларускіх абшарах, значна абмежаваны ў сваіх правох у параўнаньні з такімі-ж самаупраўленьнямі ў самой Польшчы.

Скажам над гміннай радай у нас стаіць павятовы стараста, і калі-б рада што-небудзь пастанавіла ня зусім згоднае з поглядамі і пэўнымі правамі старасты, дык гэткія пастановы ня былі-б праз старасту зацьверджаны.

Гэтае цяперашняе наша куртатае самаўпраўленьне прыпамінае нам тыя куртатыя расейскія самаўпраўленьні на нашых землях, якія былі заведзены тут, у на. Будзем спадзявацца, што цяперашняе шкоднае для нас самаўпраўленьне будзе новым Соймам зьменена, але, каб меньш крыўдаў было нам цяпер, трэба ўмець скарыстаць і па гэтых нявыгодных для нас законах належачыя нам правы.

Возьмем пытаньне аб нашай школе, гэтае самае балючае пытаньне сучаснага жыцьця беларускае вёскі. Як ні б'ецца вёска, як ні клапоціцца аб адчыненьні сваёй роднай школы,—кожны раз выплываюць наверх усё новыя перашкоды ў змаганьні з якімі трапіцца безканечна час і грошы, і ніяк чалавек вясковы ня можа дабіцца сваёй мэты. У чужую для яго школу польскую ён не пасылае свайго дзіцяці, школы на сваёй роднай мове адчыніць нельга і ў рэзультаце пануе з ласкі польскае школьнае ўлады цемра, дзічэюць дзеці, пашыраецца нянавісьць да ўрадавых інстытуцыяў, ад волі якіх залежыць спаўненьне ці не вымаганьняў сялянства.

Што-ж нам рабіць па вёсках, каб на аснове істнуючых законаў скарыстаць хоць тыя невялікія правы, якія нам належаць, бо трэба ведаць адно, што пакуль раскалышацца новы Сойм і зьменіць нявыгодныя для нас законы і падчас самаволю некаторых польскіх урадпікаў, можа прайсьці яшчэ нямала часу.

Вось тут і варочаемся мы да мяйсцовага самаўпраўленьня—гмічных радаў і павятовых соймікаў.

Усе школы як беларускія так і польскія ў межах гміны могуць быць адчынены толькі па пастанове гміннай рады. Гэта трэба добра ведаць, а дзеля гэтага пры выбарах гмінных радаў трэба старацца, каб у склад іх прайшлі свае людзі. І гэта тым больш патрэбна, што з самых радных выбіраюцца прадстаўнікі ў павятовы соймік, улада якога абыймае ўвесь павет. Калі толькі ў гэтых выбарных установах ды будуць свае людзі, дык значна лягчэй будзе адсоўваць ад сябе тыя крыўды, з якімі цяпер так цяжка нам змагацца (школы, падводная павіннасьць і інш.),

„Праўда, бываюць і такія выпадкі, што калі гмінная рада складаецца з сваіх людзей і прыме, скажам пастанову аб адчыненьні некалькіх школ беларускіх у межах воласьці, дык інспэктар тады езьдзіць па вёсках альбо „спраўджае“ на новым паседжаньні гміннай рады, або на сходзе ў воласьці гэтую волю сялян. Гэтае „спраўджэньне“ фактычна зводзіцца да намоваў, каб людзі выракліся свайго, каб лепш згадзіліся на польскую школу. Але гэтым інспэктарам-агітатарам рэдка ўдаецца дасягнуць сваей мэты: сяляне і гмінная рада стаяць моцна на сваім і—інспэктару Вялейскага павету хоцькі-няхоцькі прышлося адчыніць у Лебедзеўскай воласьці сем беларускіх пачаткавых школ.

Іншыя інспэктары, як валожынскі, п. Страчынскі Мечыслаў, вымагаюць, каб пастановы гміннай рады аб беларускіх школах прыймаліся ў прысутнасьці абавязкава самаго пана інспэктара. Зусім вядома, што пану інспэктару ідзець аб тым, каб паагітаваць радных проці беларускіх школаў. Але раз склад радных салідны і моцны ў сваіх пераканаиьнях, дык ніякая агітацыя нічога ня зробіць і пададзеная на пісьме заява да інспэктара праз гмінную раду аб адчыненьні беларускае школы за падпісамі сялян, сьцьверджанымі подпісам солтыса і засьведчанымі войтам дойдзець свайго.

Вось дзеля гэтага і трэба, каб пры выбарах гміннае рады нашыя людзі моцна трымаліся і праводзілі туды сваіх шчырых абаронцаў. Час нам узяцца за упарадкаваньне сваіх спраў.

Баўтручонак.

Аб новых кніжках.

У Менску выйшлі з друку новыя беларускія кніжкі—зборнікі вершаў вядомых беларускіх пісьменьнікаў: Янкі Купалы, Якуба Коласа і Зьмітрака Бядулі.

Пэўна-ж выхад у сьвет трох новых кніжак зьяўляецца прыемнай навінкай. Зборнікі вершаў найлепшых беларускіх пісьменьнікаў цікавіць нас, як збоку разьвіцьця творчасьці нашых паэтаў, так і з боку тых грамадзянскіх, нацыянальных і індывідуальных настрояў, якія адбіваюцца ў іх творах.

У іх творах шукаем мы і часта знаходзім высокія ідэалы, якія, як сонца, грэюць нас і сьвецяць нам на цярністых пуцявінах. Калі апускаюцца нашы стамлёныя рукі, калі слабее ад непасільнай барацьбы душа, — тагды мы чытаем натхненьня творы Янкі Купалы, гэтага магутнага песьняра-адраджэнца, тагды бяром мы ў рукі „Сымона Музыку“ Якуба Коласа і дзіўная музыка чыстай народнай мовы гэтага паэты, з'еднаўшысь у нашай душы з глыбокай філёзофскай думкай Купалы, утварае душэўную гармонію, душэўную раўнавагу. Сілы ўваскрэсаюць. Душа аджывае і моцныя арліныя скрыдлы зноў падымаюць нас над будзёншчынай.

Кінем-жа вокам на тыя настроі, якія адбіліся ў новых кніжках нашых паэтаў.

Кніжка Янкі Купалы «Спадчына» поўна скаргі на сучаснае жыцьцё. Няма нідзе праўды, кругом гнёт, гвалт і зьдзек над душой чалавека, над яго свабодным словам, над уласнымі перакананьнямі. Самаго Бога прызывае Купала ў адным з найлепшых вершаў к адпаведнасьці за горкую долю замучанага, ўсімі пакрыўджанага беларускага народу. Густая цьма няпраўды, страшная ўлада цемры пануе над жыцьцём і няма выхаду з гэтай нетры, куды заведзен бедны народ. Манаю і няпраўдай загублены. Цяжкі пэсымізм заўладаў душой паэты. Як птушка ў клетцы, б'ецца разьбітая душа нацыянальнага прарока. Так чуе паэт, паэт—душа народу. І калі рвецца ад болю душа паэты, дык рвецца і плача пад уціскам і засмучоная душа народу.

Другая кніжка, невялічкі зборнік вершаў Якуба Коласа „Водгульле“, ня можа быць паказацельнай для разьвіцьця таленту нашага пісьменьніка. Бо вершы, надрукаваныя ў зборвіку напісаны паэтам яшчэ ў маладыя гады, больш усяго вершаў, у якіх адбілася астрожнае жыцьцё Коласа. Як вядома, наш паэта тры гады адсядзеў у царскім вастрозе, з 1906 году па 1909 г. за агітацыю сярод настаўнікаў. Але ёсьць некалькі вершаў цяперашніх, з якіх і відаць моц паэты. „Кавалі другія, а ланцуг той самы“, кажа ён у адным з апошніх вершаў. А ў другім саўсім ясна, як стары рэвалюцыянэр кліча народ свой, скінуць ярмо, надзетае чужынцамі, якія падрабляюцца пад народны дух, каб лягчэй высмактаць, як павук, кроў з народу. — „Люд беларускі! скінь свае путы, новыя песьні сьпявай“. Паэта-грамадзянін горка адчувае ўсю крыўду сваей Бацькаўшчыны, крывавай мяжой падзеляную на дзьве часткі: „Нас падзялілі— хто, чужаніцы!?. К чорту іх межы, к д'яблу граніцы“. Такія энэргічныя словы вырываюцца з душы паэты, якая глыбока адчувае нацыянальнае гора.

Зборнік вершаў Зьмітрака Бядулі „Пад родным небам“ стаіць асобна. Паэта зьвярнуў увагу больш усяго на родную паэзію, якая займае першае месца ў зборніку. Так, казкі Сяржпутоўскага, дзе больш усяго адбіліся народныя вераваньня Палесься пакладзены паэтам у аснову вялікай паэмы. У мягкіх і размаітых вершах вельмі пекных і музычных паэта выказывае сваёй прыгожай арыгінальнай мовай глыбокае закаханьне да ўсяго роднага. Бядуля заўсёгды паэтрамантык. Рамантыкам застаецца ён і ў кніжцы „Пад родным небам“.

Бядуля падняўся вельмі высока па сіле, выразнасьці, размаітасьці і музычнасьці вершаў. „Пад родным небам“ гэта ёсьць лепшае што стварыў З. Бядуля. Гэта новая кніжка ставіць Бядулю на пачэснае мейсца як, аднаго з лепшых беларускіх пісьменьнікаў. Грамадзянскі настрой у зборніку адбіваецца слаба. Паэт жыве ў сьвеце фантазыі, або народнай, альбо сваёй уласнай. Багатая фантазыя— гэта дар Бядулі, выдзеляючы яго ад усіх нашых паэтаў. Але за тое, часта рэальнае жыцьцё для Бядулі няпрыкметна і не адбіваецца ў яго творах. Гэта адсутнасьць грамадзянскіх настрояў зьмяншае папулярнасьць Бядулі сярод беларускага грамадзянства. Нацыянальным пракам Бядуля быць ня можа. Аднакаж, агульна-людзкія ідэі, якімі жыве і дыша беларускі народ, знайшлі свой адбітак у прыгожых чыста народных творах Бядулі.

Закончым наш кароткі агляд новых кніжак пажаданьням, каб яны хутчэй зьявіліся ў Вільні. Наша агульная нацыянальная бяда—падзел Беларусі на дзьве часткі — дае сябе адчуваць на кожным кроку. Усё, што пішуць на тым баку, недаступна ў нас. Усё, што пішуць у нас рэдка даходзіць да аддзеляных брагоў нашых. Нават думкамі сваімі і то ня маем права падзяліцца.

Красавік.

Пісьмы з Сэрбіі.

I I

Тутэйшыя расейскія эмігранты па 3 гады ўжо пражылі, а апрача сэрбскага „добар дан“ ці „лаку ноч“ (добрай ночы) нічога іншага ня ведаюць. А калі даводзіцца ім гаманіць з сэрбам, які ня ведае іншай мовы апрача сваей роднай, дык гутарка ідзе на якой хочаце мове, толькі не на сэрбскай.

Ня думайце, што гэтыя расейцы ня здольныя людзі, або ня могуць асіліць чужой мовы. Тутака іншая прычына. Бачыце, для іх сэрбская мова някультурная, брыдкая... як наша мова для польскіх паноў.

— Сьмеху варта,—гаворыць іншы расеец з-пад Масквы або з-пад Разані: каб я губляў час на зусім непатрэбныя рэчы... за каго вы мяне прыймаеце? І на якую патрэбу здалася мне сэрбсая мова, хіба з ёю абойдзеш цэлы сьвет?

— А чым-жа гэга кепская мова? сэрбы маюць сваю літэратуру, маюць вялікіх, вядомых пісьменнікоў... за імі будучына...

— Гэ-гэ-гэ... паехалі! Можа за сэрбамі і будучына, ня ведаю, толькі ці-ж гэта паэзія:

„От любави нема лека,
Не поможе апотека...
Докторе, срце ме боле!“

І рагоча, ня прыгожа рагоча... Чалавек, ня маючы прыхільнасьці да чужой мовы, тым самым губляе паважаньне і перастае быць чалавекам.

Аб сабе-ж скажу, што я надта рад, што мне давялося пабыць ў Сэрбіі, пазнаёміцца з сэрбскім народам, з яго песьняю і жыцьцём. Тутака ёсьць на што паглядзець, ёсьць чаму павучыцца; тутака абібок робіцца працавітым, а заможны перастае нос задзіраць...

Міністар.

У кожнага з нас з гэтым словам зьвязаны успаміны, як аб нечым вялікім, да чаго ня можна ані прыступіцца, ані зачапіць пальцам. Як калісь, напрыклад, расейскі міністар,

А сэрбскі міністар...

Гэта здарылася які тыдзень таму назад. Я сядзеў ў кабінэці начальніка станцыі Прачын, чую гутаркі:

— Міністар... зараз прыйдзе сюды міністар...

Міністар? цікава! І прад маімі вачыма уваскрэслі малюнкі мінуўшчыны: царскі міністар з жандармамі і палецыянтамі...

І вось бачу праз якія небудзь 5-10 мінут уваходзіць невялічкі, грубенькі чалавечак. Начальнік станцыі ўстае на сустрыч гэтаму чалавеку і вітае яго:

— „Добар дан, господине міністар! Седіце... што радіце? Какосте?“ (Добры дзень, пан міністар! Сядайце, што робіце? Як жывіцё?).

Міністар сядае, пытаецца, ці можна „пушыць“ (курыць) і пачынае простую гутаркай распытываць аб справах.

Міністар тутака лічыцца як абычайны чалавек, бо да яго ўсе чыста маюць доступ і ён павінен кожнага выслухаць і кожнаму параіць. Тутака, бараточкі мае, міністар ня ездзіць з цэлай табалой „арханялаў“ і не адварачывае свайго носа ад мужыцкага паху, бо ён сам з мужыкоў!

„Лаку ноч!..“

Яшчэ адзін крок, яшчэ адзін стогн чалавечай змогі і кончыўся дзень. Адбыўся час працы, пачаўся час адпачынка!

І людзі, і кветкі, і неба, і страшэнныя горы, ўсё чыста злілося ў адзін зык:

— „Лаку ноч“ (добрай ночы)!.. „Лаку ноч“!..

— „Лаку ноч!... Лаку ноч!..“ — нясецца наўкола.

Гаспадар і гаспадыня вярнуліся з поля. Іх твар, чорны і запаліўшыся ад сонца, яшчэ гарыць здавальненьнем, яшчэ носіць сьлед вялікага сьвята сьвята сялянскай працы!

Ціха, бяз гоману павячэралі. Гэтак-жа ціха, бяз жаднага слова маладая гаспадыня распранулася, вымыла сабе і мужу ногі, пацалавала яго ў руку і сабраліся на супачынак.

— „Лаку ноч!..“

Мне ня хочыцца спаць ды нешта сумна, цісьне ў грудзёх...

Выходжу на двор... Са ўсіх чыста бакоў пяюць пеўні: гэта яго лаку ноч! сэрбскі певень пяе і ў вечары і зраньня.

Іду вуліцаю... Вёска ўжо сьпіць, ня чуваць гоману, ня відаць закаханых— і дзевойчыцы (дзяўчаты) і момкі (хлапцы) ўсе ужо сьпяць

Выходжу ў поле, і там ўсё чыста сьпіць, нават горы і тыя ня йдуць на цябе, а моўчкі стаяць, як стаіць асілак-вартаўнік сэрбскага цара Душана з пекнай народнае казкі.

Стаю і я... Ды куды ісьці? з аднаго боку горы, а з другога—вёска з пяненьнем пеўня з людзмі для мяне чужымі. Куды ісьці мне беспатольнаму і згнаньніку без кутка на чужыне.

— А бацькаўшчына?—пранасіцца думка яскравая як маланка.

Мілая бацькаўшчына! Але і там цяпер ня весяла жывецца. Даходзяць весткі пра гвалт, пра зьдзек...

Закладайма народныя выдавецтвы!

Беларускае друкаванае слова ня мае дагэтуль запэўненага жыцьця таму, што пад ім няма моцнай матэр'яльнай падставы. Асабліва так можна сказаць аб беларускіх газэтах, якія часта спыняюць сваё жыцьцё ня толькі з прычыны адміністрацыйных загадаў, а таксама і ад вычэрпаньня грошаў.

Газэтная праца, як усякая іншая гаспадарчая і гандлёвая справа вымагае добрага забясьпечаньня капіталам, а калі такога няма, дык самыя лепшыя жаданьні, а нават афярнасьць работнікаў нічога ей не дапамогуць. Для выдавецкай справы неабходны вялікія грошы: трэба закупіць паперу ў адпаведны момант і мажліва у большым ліку, бо толькі у такім разе яна выйдзе таней, трэба адразу друкаваць, разьлічаючы ня толькі на падпішчыкаў, але і на тых, якія падпішуцца потым, або будуць што раз купляць газэту. Затрачаныя на гэтыя патрэбы грошы вертаюцца вельмі павольна; ведама, што кнігі і, наагул, друкі робяць ў гандлю найменьшы абарот. Праўда, грошы за газэты зьвертаюцца шпарчэй, але шмат капіталу ляжыць цэлыя гады, чакаючы пакуль разкупяць старыя гадавыя камплекты. Беларускія газэты павінны друкавацца яшчэ з большым запасам дзеля таго, што нашыя газэты—заўседы, напалову, літэратурныя, а таму ня трацяць на вартасьці дзесяткі гадоў.

Вось чаму выдавецкая справа вымагае вялікай грашовай сілы, капіталу, які могуць даць у сучасны момант толькі капіталісты. А тут гістарычныя абставіны злажыліся так, што мы ня маем сваей уласнай буржуазыі, багацеяў, якія бы зацікавіліся хоць ня ідэямі, а тымі барышамі, што дае добра наладжанае выдавецтва. Практыка паказала, што пры дастатку грошаў самыя бяздушныя, бязідэёвыя газэты трываюць і даюць сваім гаспадарам вялікія прыбыткі.

Але нам ідзе не аб прыбыткі. Ужо бязумоўна пасьпела патрэба ў сталай паважнай беларускай газэце. Народ чакае, патрабуе яе.

А калі так, дык сам народ павінен збудаваць здаровыя гаспадарчыя падставы для свайго друкаванага слова, сам павінен даць патрэбны капітал, і заляпіць капіталіста, якога ў нас няма, ды, можа, й ня будзе.

Варункі жыцьця нам спрыяюць.

Дагэтуль ніхто не аддаваў сваіх зьберажэньняў ні ў банкі, ні ў коопэратывы, бо аддаваць маркі, нават пад вялікі процэнт, каб атрымаць іх назад, калі яны ў некалькі разоў страцяць на вартасьці, ня было рашчоту. Цяпер, карыстаючыся з новай польскай валюты—„злотых“, якія роўны швайцарскаму франку, найбольш сталай на сьвеце валюце, можна быць спакойным, што грошы не прападуць, ня страцяць свайй вартасьці, што заўсёды атрымаеш назад тое, што улажыў.

У гэтых варунках робіцца мажлівым залажэньне выдавецкага коопэратыва, які бы абхапіў усіх чытачоў беларускіх газэт.

Кожны беларус, які любіць і чытае сваё роднае друкаванае слова і хоча, каб справы народнай прасьветы пасуваліся далей, мусіць даць сваю часьць для стварэньня народнага выдавецкага капіталу, мусіць уступіць у сябры выдавецкага коопэратыва, да закладзін якога прыступлена.

Таксама і той, у каго ляжаць зьберажоныя вольныя грошы, няхай укладае іх у выдавецкую справу, як улкады і пазычкі, цьверда памятуючы, што яго грошам безпячней, чым ў спэкулятыўным банку; гэтыя грошы абярнуцца ў цэннасьці, якія ня страцяць на вартасьці, бо газэты і кніжкі з кожным годам усё шырэй будуць разьлівацца ў народных масах.

Мы павінны напружыць усе высілкі, каб залажыць такі коопэратыў і, тым самым даць мажлівасьць нашай прэсе рабіць спакойную творчую працу бяз трывогі аб чорным дню. Толькі ў такім выпадку беларуская выдавецкая справа, а ў першую чаргу выдавецтва беларускай газэты ўстане на цьвёрды грунт.

Дык вось жа, беларусы: ваш абавязак стварыць беларускае народнае выдавецтва—выдавецкі коопэратыў.

Грамадой ідзеце запісывацца у гэты коопэратыў, каб супольнымі сіламі замацаваць фундаманты нашай адраджонай культуры.

Ігнат Канчэўскі.

Ад Рэдакцыі: Ініцыятыўная група прыступіла да утварэньня беларускага выдавецкага коопэратыва.

Атрымаць усе выясьненьні ў гэтай справе а таксама запісацца ў сябры гэтага коопэратыва можна ў рэдакцыі „Нашай Будучыны“.

Падрабней глядзіце ў абвестцы па 4 страніцы.

Дзеткі ходзяць разугымі, а іх бацькі ў падзёртых сьвітках і без правоў на імя чалавека. Нядоля скавала беларуса, а ён лятуціць аб сваім незалежным бытаваньні.

І яшчэ горш на сэрцы... жаль расьце, пашыраецца і цякуць, цякуць сьлёзы.

А наўкола ніводнага гука, ніводнага водгульля.

М. Запольскі.

◆◆◆◆

*

Здратавана рунь. Плач галодных дзетак.
Лядай глядзіць сад. Скрозь пакосы кветак.
Мучальнікаў кроў. Матак роспач, сьлёзы
Пажарышчы сёл. Бежанцаў абозы.

Крыж нясе любоў. Радасьць церні раняць.
Праўду ратаёў немачай паганяць.
Грабаром жыцьця воля падпявольна.
Будзе, ёсьць, было: доля беспатольна.

Будзе, ёсьць, было душам забуцьвелым,
Думам без пладоў, думам перасьпелым.
А мо гэта ёсьць мудрасьці адвечнай
Праўда усіх праўд, — мукай безканечнай?..

. . . .

Вецер у сьцяну ночы злой задрагаў.
Вецер здзьмухануў пыл тугі са сьцягаў.
Певень запяяў. Дзень сабраў ўсе росы.
Гук загаманіў гудам шматгалосым.

Выклікала з пушч сонца залатое
На абшары ніў вечна маладое—
Для жывых жыцьцё нова засьвітала,
То, што ня было, златацветам стала.

Л. Р.

* * *

Л. С—вой.

Твае пісьмо... пасьля даўгіх гадоў
Растаньня, сноў благіх, надзей абман-(ных.
З трывогаю ў радкі ўглядаю слоў
Рукою пісаных каханай.

Узбуджаюцца дзіўныя пачуцьці,
Узрушаная мысьль ўяўляе жвава,
І абразы, што зьніклі ў забыцьці,
У памяці ўстаюць яскрава,
І твой аблік ласкавы, мілы,
Пастаць і пасмы сьветлыя валос
І к перамогам з новай, клічаць сілай
Мяне зьнямогшага ад сьлёз,
І радасьць сьветлая з радкоў цячэ,
І абнаўленьня чары ў сэрцы сее...
Нібы ня ўсё загублена яшчэ
Нібы магчымы йшчэ надзеі...

2-XI-22 г.

Ул. Жылка.

Памяці Івана Луцкевіча.

Ен са сьветачам хадзіў сярод чорнай ночы.

Ен магутнай рукой удараў у званы, склікаючы беларускі сярмяжны народ на сход, на беларускі сход.

Ен будзіў, будзіў, будзіў....

І хоць ноч глыбокая была кругом, але ён ня спаў. Сьветлыя думкі, вера ў адраджэньне давалі яму моц і крыльля і зрабілі яго вечна жывучым. Ня мог ён спаць, калі народ спаў у забыцьці, калі лепшыя дзеці Беларусі блудзілі ў пацёмках.

І ён будзіў, будзіў.

. . . .

Пры усходзе сонца ён падняў дзярван нашага задзерванелага поля і узгадаваў нашую ніву на радасьць небу, на карысьць бедных людцаў.

Прабуджаны народ, вітаючы штодня усход сонца, успамінае яго добрыя учынкі і сьветлыя думкі і сьмела, радасна бярэцца за працу, за паляпшэньне сваей будучыны.

В. Сосенскі.

Кожны беларус павінен чытаць сваю газэту.

Выпісывайце і складайце ахвяры на сваю газэту.

Змаганьне за беларускую школу.

◆ Школьны інспэктар Дзісьненскага павету на захады вучыцеля Чэрэпа аб адчыненьні прыватнай беларускай школы ў вёсцы Мальковічы, Мікалаеўскай гм. адказаў, што калі ён адчыніць беларускую школу, дык будзе строга пакораны, бо ён інспэктар ніколі не дазволіць адчыніць няпольскую школу.

◆ Той жа самы інспэктар не дазволіў сялянам вёскі Дарожкі, Язьненскай гм. адчыніць беларускую школу, хоць яны прадставілі прыгавор аб школе 90 падпісямі.

◆ Сяляне вёскі Ардзея, Беніцкай гміны (Ашмяншчына) пасьля доўгіх дамаганьняў адчынілі беларускую школу. Але сёлета школьны інспэктар вучыцеля гэтай школы назначыў у польскую школу, а на яго месца прыехаў паляк. Сяляне спаткалі яго ветліва, як кажаць, чым хата багата, але рашуча зазначылі, што вучыцеля яны хочаць мець толькі беларуса і няпрошаны госьць, падзякаваўшы за гасьціны, на другі дзень выехаў.

◆ На ўсю Юрацішскую гміну ёсьць толькі дзьве польскія школы і гэтыя хутка зачыняцца, бо дзеці перасталі хадзіць з прычыны таго, што не разумеюць вучыцялёў палякаў.

Дописы.

Як польская адміністрацыя „urzęduje na kresach“.

◆ Вялейскі стараста ня даў дазво гр. Ф. Аляхновічу на беларускі спэктакль у Маладэчыне 7 сьнежня. Мелася быць пастаўлена „Паўлінка“ Купалы.

◆ Кіраўнік пошты Даўгінава ня прыняў падпіску на беларускую газэту ад селяніна вёскі Вардмічы (Вялейшчына), бо селянін не паслухаў яго нагавораў выпісаць польскую газэту.

◆ На пошце Парахвіянава (Дунілоўскі п.) ад гр. Войціка адмовіліся прыняць „polecone“ пісьмо, дзеля таго, што названьне газэты было напісана пабеларуску, хоць увесь адрэс быў напісаны папольску.

Цемрадзь і п'янства. (Вялейшчына). Пьюць як ніколі. У гарэлцы заліваюць сваё гора, свой цяжкі лёс. Страшна... і сумна... Дзеткі бяз навукі бегаюць па вуліцы. Дзе-нядзе ёсьць польская школа, але сяляне ня хочуць туды пасылаць сваіх дзяцей. У іншых мяйсцах дык сяляне тут-жа, пад бокам польскай школы адчыняюдь прыватную беларускую, як напр. у вёсцы Хадасох (Альковская гміна).

Чакалі сяляне сваіх вучыцялёў з Кракава, але як чуваць іх пашлюць у Польшчу. На просьбы гэтых вучыцялёў, каб іх заставілі дома, дэлегат Міністэрства Прасьветы адказаў, што ў Віленскім вучэбным акругу зусім мала вакантных мейсц. (Усіх вучыцялёў у Кракаве было 238.) Адзін здзек і ашуканства! У адзін Вялейскі павет трэба найменей 150 вучыцялёў. І йзноў аставяць нас бяз сваіх настаўнікаў.

Цямната на вёсцы страшэнная.
Дрэненька ў нас жывецца!..

У. Н.

Няма каму заступіцца. У мяст. Гардзея Нясвіжкага п. на кірмашы вахмістр 26 палка Томчык зьбіў селяніна Вінцэнтага Касьцюка за тое, што едучы міма ваза Касьцюка зачапіўся за яго вось.

Гэты Томчык вядомы ўсім акалічным жыхарам як буян і самавольнік і нягледзючы на жалабы начальству яго не ўціхаміраць.

Ніштожаць лясы. (Дунілаўскі п.) Ніколі ў нас так не зьніштожалі лясы, як у сёлетнім годзе. Панаехала шмат лясных спэкулянтаў, адкупляюць у паноў лес, высякаюць без ніякай асьцярогі і адпраўляюць у Польшчу. Спэкулянты вельмі чамусьці спешаюцца і апрыч таго, што дрэва атпраўляюць на хурманках да чугуначнай станцыі Парафіянава, яны паправілі вузкакалейку папсутаю ад часу вайны. І лес вывозяць безупынна. Сяляне зарабляюць вялікія грошы адвозячы дрэва да чугункі. Але ёсьць сьвядомыя сяляне, якія добра разумеюць, што ў хуткім часе прыдзецца са ўсяго гэтага дрэныя плады зьбіраць.

Берніна.

У Новым Пагосьце Дз. павбыў выбраны летам на войта гміны селянін беларус Чарвінскі; колькі разоў ня зьвярталася гмінная рада да Старасты павятовага, аб яго зацьверджэньні, але Стараста адмаўляўся ўвесь час і ўрэшці вызначаны быў на войта буйны землеўласьнік Федаровіч, наляк, не пажаданы для сялянскай беларускай грамады. Секрэтаром гміны служыць прыездны з цэнтр. Польшчы паляк, які зусім не разумее пабеларуску, а сяляне не разумеюць яго. Вось абраз нашага жыцьця.

Якжыў.

Асаднікі—няшчасьце нашае. У маёнтку Падзеневічы Ярэміцкай гміны, Навагрудскага пав. пасяліліся асаднікі, якія паўзворывалі усе дарогі, істнаваўшыя з даўных часоў, а самі ездзяць сялянскімі шнурамі. Апрача гэтаго яшчэ робяць гэткія зьдзекі і зьверствы. Адзін селяцін з вёскі Новага-села ехаў да мястэчка, якраз яму трэба было ехаць тэй дарогай, якую чужынцы гэныя ўжо ўзаралі. Калі убачылі гэта асаднікі, зараз-жа давай страляць па селяніну, а пасьля дагнаўшы пачалі біць кольki ім хацелася, і прыгаварывалі: „My tobie chamie pokażemy, jak przez naszą ziemię jechać.“ Пасьля гэтага селянін хварэў цэлы месяц. Есьць паміж імі адзін буян Краўчык, які зьяўляецца як бы атаманам. Бяз гэтага атамана асаднікі нічога ня робяць. А з ім яны наводзяць страх на усю ваколіцу як напрыклад: у вёсцы Лядках вельмі часта б'юць жыхароў вёскі, бьюць вокны, выламліваюць дзьверы, і т. д.

Ю. Камар.

◆◆◆◆

Палітычныя падзеі.

Англія. Найважнейшай справай ў Англіі ёсьць справа безработцьця. Праваднікі работніцкага руху зажадалі канфэрэнцыі з цяперашнім прам'ер-міністрам Бонар Лоу для ўпарадкаваньня гэтай справы. Безработныя зноў гатуюцца да маніфэстацыі за скліканьне парлямэнту.

Францыя. Клемансо выказаўся проці рэпрэсій над Нямеччынай, якія задумала ўжыць Францыя ў выпадку, калі Нямеччына адмовіцца плаціць вайскавую кантрыбуцыю. Клемансо стары палітык і знае моц Нямеччыны, таму хоць рад быў-бы выцягнуць з яе найбольш, але хацеў бы не давесьці да вайны, ў якой перамога была-б ня ведама яшчэ на чыей старане.

Польшча. Міністэрства Унутраных Спраў аб'явіла рэгістрацыю мужчын, якія радзіліся ў 1883 — 1899 г. г. Рэгістрацыя пачнецца 20 студня г. г.

Ягіпет Урад Ягіпета дамагаецца выдаленьня англійскага войска і незалежнасьці для Ягіпта.

Надрэнія жадае незалежнасьці. У Боні адбыўся кангрэс усіх партый Надрэніі, якія аднагалосна вынеслі рэзалюцыю, трэбуючы незалежнасьці для Надрэніі.

Літва. Паўстанчыя адрады і рэгулярныя войскі занялі Клайпэду. Паўстанцы апрануты ў цывільнае з лампасамі і ўзброены вінтоўкамі. Літоўскае пасольства ў Бэрліне выдала афіцыяльны камунікат, у якім прадстаўляе напад на Клайпэду, як паўстанчы рух не падтрымліваны ўрадам. Гэты рух выклікаў камітэт вызваленьня Клайпэды, які нібыта лічыцца насяленьнем за праўдзівы ўрад.

Лазанская канфэрэнцыя. З Лазанны паведамляюць, што перагаворы цягнуцца далей. Дойдзена да цэлага раду парузуменьняў. У пытаньні аб цывільным насяленьні пастанавілі, пакуль абмяняць грэкаў з Малое Азіі і турак з Македоніі. У пытаньні аб патрыарху Ісмэт-Паша выказаўся, што па колькі ўсе дзяржавы згодзіліся на адабраньне ад патрыарха цывільнай улады, туркі адмаўляюцца ад дамаганьня выдаленьня патрыарха з Канстантынопаля.

Аўстрыя. Пазычка, якую дастала нядаўна Аўстрыя ад Антанты, нічога не дапамагла. Дзяржава палепшыла свае фінансы на нейкі час, але не магла зьліквідаваць голечы і безработцьця, што шырыцца ў Аўстрыі.

Грэцыя. У Афінах зноў вялікае забурэньне. Можна чакаць выбуху но-

вай контрэвалюцыі, якая можа быць зьвернута ня супроць караля, але супроць вайсковай партыі.

Нямеччына. У Нямеччыне няма дабра. Францыя стараецца за ўсякую цану сьцягнуць, як больш ваеннае кантрыбуцыі, на што Нямеччына ні якім чынам ня можа згодзіцца. А калі Нямеччына плаціць, то толькі з тэй думкай, што ў найбліжэйшай будучыне адбярэ ад Францыі ў шмат раз больш.

Першая жанчына -- прафэсар у Варшаўскім унівэрсытэце.

28 лістапада 1922 г. п. Цэзарыя Бодуэн-дэ-Куртэнэ была дапушчана чытаць лекцыі ў Варшаўскім унівэрсытэце. Першая яе лекцыя была на тэму: „Скандынавізм у беларускім і расейскім фольклёры“.

✦✦✦✦

Літоускія справы.

Вучыцельскі зьезд.

28 і 29 сьнежня 22 г. адбыўся з'езд нэродных вучыцелеў літовскага т-ва „Rybo“.

Выявілася на з'езде страшэнна дрэнныя варункі абучэньня. У мястох заселеных большасьцю літоўцамі палякі робяць усялякія перашкоды каб адчыніць літоўскія школы. Вучыцелі, што прыватна працуюць высылаюцца. З боку улады ніякой дапамогі няма. Пэнсіі вучыцелям выдаюцца надта мізэрныя і каб не дапамога саміх сялян ня былоб ніякой магчымасьці існаваць. Ня гледзючы на тое, што лік вучняў у большасьці мейсьцох даходзяць да значной лічбы валасныя і паветовыя Улады памешканьні не даюць. Ні лавок, ні сталоў у многіх школах зусім няма. Ва усіх школках адчыненых таварыствам „Rybo“, абавязкова высылаюцца польскія вучыцелі, понаехаўшыя з Галічыны, Пазнані і перашкаджаючыя працы. Але ня гледзючы на усё, лік школ, дзякуючы вымаганьням селян, формальна ў некоторых мейсьцах повялічыўся (Свянцянскі павет). Лік вучняў даходзіць у некатарых школках да 70-100 асоб. Быт вучыцялеў у мястечках шмат горшы чым у весцы, з прычыны адсутнасьці дапамогі, а толькі жалованьня не даходзячая да 70 тысяч у месяц, у той час як польскія вучыцелі атрымываюць шмат болей, Улада ставіць вымаганьне, каб усе вучыцелі былі з сярэдняй адукацыяй і мелі польскае падданства. Асабліва цяжкія варункі у Лідзкім павеце. Заявы сялян зусім ня прымаюць под ўвагу. Асабліва перешкаджае працы паліцейскі дагляд.

У прынятай рэзалюцыі пастанавілі дамагацца:

1). Каб літоўская школьная справа была звольнена з пад паліцейскай апекі,

2). Каб польская Улада назначала ў школы літоўскіх вучыцялёў і рупілася аб матэр'яльных варунках.

3). Каб прыватная літоўская ініцыятыва ў справе асьветы ня былаб прыціснена.

4). Каб дамовае і прыватнае абучэньне не забаранялась.

5). Каб асобы, займаючыяся народнай асьветы ня быліб прасьледаваны і

6). Асвабадзіць і вярнуць сасланых

Прысутнымі на з'ездзе было каля 100 вучыцялёў, прадстаўніца польскага Ураду п. Якубоўская і прадстаўнікі розных арганізацый і прэсы.

(Rytu Lietuva).

Прыдзірка.

Мясцовая Улада запатрабавала выкінуць з печаткі Вілен. Літоўскай Гімназіі пагоню, як гэрб чужога гаспадарства. Адзначаючы гэты факт газэта „Rytu Lietuva“ піша.

„Дзіўная рэч, Пагоня гэтаж ня толькі знак Літвы, але і места Вільні. Пагоню не гналі адсюль і расейцы, якія пакінулі яе нават на ўсю Віленскую г. Хутка мабыць выйдзе прыказ аб тым, што забаронена насіць яго на пятлічках, што рабілі самі палякі ў часы свасй няволі“.

✦✦✦✦

З Беларускага жыцьця.

✦ У Менску вышаў зборнік вершаў З. Бядулі „Пад родным небам“.

✦ 9 студня бандыты забілі бацьку пасла кс. А. Станкевіча, які меў сваю гаспадарку ў Ашмяншчыне.

✦ К. Душэўскі пераклаў на беларускую мову трыганамэтрыю, якая ў хуткім часе будзе выдадзена ў Коўні.

✦ „Маладое Жыцьцё“. Вышаў з друку і прадаецца № 1 (III год выданьня) часопісі беларускае моладзі „Маладое Жыцьцё“ з гэткім зьместам: 1) „Новый Год“—верш. Ст. 2) „Нашым Крытыкам“. 3) „Францішак Багушэвіч“—Яр. 4) Уладзімір Калаўр (†). 5) „Я жадаю песень волі“—верш С. Глебава, 6) „⁂“ памяці друга. 7) „Якім Дзераза“ — апаведаньне Гарасіма. 8) „Нёман“ — верш Глебаў. 9) «Маладое Жыцьцё» — верш Заполскага. 10) „Сьвяточныя успаміны—В. Г—н. 11) «Ірышча» -- верш. 12) „Крышку вясёляга“. 13) „Фельетон — запісаў Бім. 14) Хроніка. 15) Жыцьцё беларусаў за межамі. 16) Ліст праз рэдакцыю. 17) Свая пошта.

Цана асобнага нумара 500 м.

✦ Пры Віленскай беларускай гімназіі створана I Беларуская дружына скаўтаў. За кіраваньне арганізацыі ўзяўся, добра разумеючы яе вуч. VIII кл. Прохараў.

✦ Вучыцель п. Зенкевіч ахвяраваў I-ай беларускай дружыне скаўтаў 100000 марак на справы арганізацыі.

(Мал. Жыцьцё).

✦ Цантральнея Беларуская Школьная Рада даводзіць да ведама сяброў Т-ва Беларускае Школы, што 14 студня 1923 г. (у нядзелю) ў Вільні, Біскупская 12 (памешк. Белар. Клюбу) а 12 гадз. дня назначаны агульны вялікі сход сяброў Т-ва Белар. Школы дзеля разгляду справаздачы старога Ураду і выбараў новага. Калі згодна § 34 Статуту ня прыбудзе устаноўленага ліку сябраў сход адложыцца на дзень 28 тагож студня бяз зьмены яго гадзін і мейсца. I будзе лічыцца правамочным, не знажаючы на лік прыбыўшых сяброў.

✦ У нядзелю 14 студня г. г. а 4 г. ўвеч. ў памяшканьні Беларускага Грамадз. Сабраньня (Біскупская, 12) адбудзецца агульны сход сяброў Віленск. Белар. Т-ва помачы пацярпеўшым ад вайны, на які запрашаюцца усе сябры Т-ва.

Парадак дня:

1) Справаздача Камітэту.
2) Рэарганізацыя Т-ва.
3) Бягучыя справы.

Камітэт.

„Усход“ і „Зорка“.

У гэтым годзе ў 1-ую Віленскую Беларускую Гімназію паступіла шмат сялянскіх дзяцей і гімназія па свайму складу вучняў і па іх зашкольнай працы прыняла ярка нацыянальны характар. Часьцей стала выходзіць з багацейшым зьместам часопісь вучняў „Маладое Жыцьцё“, арганізаваўся струнны аркестр і хор, жывей працуе вучнёўская бібліятэка, арганізуюцца бойскауты, выпрацовываецца статут і робяцца захады для залегалізаваньня Гуртка Моладзі. Асабліва радуець першыя пачынаньні, на літэрацкай ніве вучняў ніжэйшых клясаў, якія выдаюць адбіваныя шапірографным спосабам ілюстраваныя часопісі „Усход“ і „Зорка“. Абедзьве часопісі па зьместу даюць зразумець, што іх тварцы дзеці працоўных сялян, якіх доля:

„Ты мужык, цёмны люд,
Ні пісаць, ні чытаць ты ня ўмееш,
Век свой косіш, гарэш,
Для чужых толькі жнеш ты ды сееш“

Х. Іль—віч.

Ужо гэтыя падрастаючыя дзеці адчулі крыўднае, благое соцыяльнае становішча сваіх бацькоў. Адчуваюць также і палітычны занепад свайго народу, нацыянальную крыўду:

Даволі песьні пець чужыя,
Давайце будзем пець свае,
Бо ў нашай песьні словы жывыя.
Яны вядуць нас к барацьбе.
Дык з Богам, брацьця, усе за дзела,
Паўстанем дружна грамадой
Ды возьмемся адважна, сьмела
Мы працаваці за Край свой."

А. Салагуб.

„Многа гадоў таму назад, калі наша матка—Беларусь была незалежнай старонкай усе сасэдзі дзівіліся, навет і баяліся яе, і заводзілі з ёй розныя зносіны. Але гэта ўсё было тагды, калі ў нашай Беларусі сьвяціла сонца яснае. Потым началі патроху з усходу і захаду наплываць на нашую старонку чорныя хмары і сталі панямногу закрываць нас ад сонца. Рабілася што раз цямней і цямней. Нарэшце зусім сьцямнела. Як лясныя ваўкі наляцелі на нас злыя людзі з усіх старон. Закавалі нашу старонку Беларусь, а нашых продкаў парабілі сваімі нявольнікамі. Яны старанна спусташалі нашы нівы, рубілі нашы лясы. Пусьцілі нашых продкаў з торбамі па сьвеце. Крык, стогн напаўняў нашу старонку. Усё гэта было тагды, калі на нашай зямлі чарадаваліся чужынцы. Кожны хацеў перацягнуць к сабе Беларусь і ўзяць яе ў няволю.

Апусташыўшы нашы гарады, мястэчкі і сёлы, ўзялі нашых людзей пад ярмо.

Доўга ўсе цярпелі..

Але вось недзе далёка пачала займацца зорка, ўсё балей і балей асьвячала нашу старонку. Азарала яна бел. чырвоным-белым цьветам. Прачнуўся сялянін-земляроб ад свайго доўгага сну. Запрог свайго сівога коніка і пайшоў з сошкай сустракаць гэтую ясную зару. I глянуўшы на неба задрыжэла яго сэрца, а з грудзей вырваўся крык.

— Ты будзеш жыць наша, матка Беларусь!"

М. Мятла.

Вельмі ўдалыя лірычныя вершыкі (чуецца ўплыў Я. Купалы): „Родная Старонка“, С. Станкевіча, „Вясна“ Б. Станкевіча і „Ноч“ Х. Іл—віч.

Шмат дзіцячага пачуцьця ўложана ў апавяданьня: „Першая двойка“ Ч. Ханяўкі і „Восень“ Буднічанкі.

Макюнкі „Усхода“, падпісаныя Р. С. шмат выдатней малюнкаў у „Зорцы“. Зроблены яны сьмелымі штрыхамі і багацейшыя па думцы.

Будучына Беларусі ў пэўных руках

Яваш

З жыцьця студэнтаў.

У Празе.

Група беларускіх студэнтаў у Празе выдае штомесячнік „Беларускі Студэнт“. Мэта часопісі асьвятляць жыцьцё студэнтаў у Празе і досьледы аб нацыянальным пытаньні.

Курс на грошы.

(Віленская біржа.)

Афіцыяльна за 12 студня.

Нямецкія маркі	— —
Франкі францц.	— —
Доляры	20.775
10 руб. золатам	116.600

Свая пошта.

Гр. Сьветлавастокаву. Анкеты можа і павінен запоўніць кожны сьвядомы беларус. Адпаведны матэр'ял пры жаданьні можна заўсёды знайсьці. Газэту 30 экз. пасылаем. Стацьцю, аб каторай вы пішаце, рэдакцыя не атрымала.

Беларускі Студэнцкі Саюз

унівэрсытэту Ст. Баторага просіць беларускае грамадзянства памагчы

найсьці памешканьне

ў гор. Вільні для „Студэнцкай хаты“, каб мець магчымасьць ажыцьцёвіць прынятыя пастановы Саюзам ў культурна-арганізацыйным напрамку.

З прапазыцыяй просім зьвертацца ў рэд. „Н. Б.“

✦✦✦✦

Беларускі паказальнік.

Віленская Беларуская Гімназія (8 клясаў) — Вострабрамская вул., 9.

Віленскі Беларускі Нацыянальны Камітэт — Вострабрамская вул. № 9.

Віленскі Беларускі Музыкальна-Драматычны Гурток — Біскупская № 12-6.

Беларуская Урадовая гімназія Dangavpils Varsava iela 16.

Рыскі аддзел Беларускага Культурна-Прасьветнага т-ва „Бацькаўшчына“ — Łatwija, Riga, Nikołaj ul'a 20 dz. 1.

Беларускае Культурна Прасьветнае т-ва „Бацькаўшчына“ у Латгаліі — Łatwija, Riga, Witebskaja, 16.

Люцынскі Аддзел Беларускага Культурна Прасьветнага т-ва „Бацькаўшчына“ у Латгаліі — Łatwija, Lucyn Sjebeżskaj 66.

Рада Беларускай Каленіі у Латвіі. — Łatwija, Riga, Bulw. Totlebena, 7-3.

Навагрудзкая Беларуская Гімназія Навагрудак.

Нясьвіжская Беларуская Гімназія. Нясьвіж.

Беларускае Выдавецкае т-ва Вільня, Віленская 8.

Таварыства Беларускае Школы і Цантральная Беларуская Школьная Рада Вільня, Віленская 12

Беларуская Кнігарня — Вільня, Завальная вул. 7.

„Беларускі Звон“ Вільня, Вострабрамская вул 9-23.

Беларускае Прэс-Бюро у Рэвалі — Europa. Estonija. Rewal. Post-Kast 153, Biełaruskaje Press-buro.

Белар. Аддзел пры Мініст. Прасьветы у Латвіі — Łatwija, Riga, Nikolaja eela 36 a.

Weis Damhenisches Presburo — Dancig, I, „seutm 11“.

Беларускі Студэнскі Саюз — Віленская вул. 12-6.

Беларускі пасольскі клюб. Warszawa, Sejm Rzeczypospolitej.

Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу

1) Вільня, Віленская вул. № 12. кв. 6.
2) Горадня, Мастовая 9.
3) Воукавыск, Пясковая 14. У гэтых сэкрэтарыятах пасла прыймаюць кожную нядзелю ад 10 да 1 г.

Беларускі Цантральны Камітэт помачы пацярп. ад вайны. Вільня, Віленская, 12, 6.

Віленскі Беларускі Камітэт помачы пацярп. ад вайны. Вільня, Вострабрамская 9-24.

Горадзенскі Бел. Кам помачы пац. ад вайны. Горадня, Мастовая, 9.

Беларуская Драматычная Майстроўня Вільня, Вострабрамская, 9.

Беларускі прытулак. Вільня, Вострабрамская, 9.

Беларускі Жаночы Гуршок. Вільня, Вострабрамская, 9.

Эміграцыйнае бюро у Гданску. Gdańsk III. Damm II. Weis-ruthenische Informationsbüro.

«Маладое Жыцьцё» Вільня, Вострабрамская, 9.

„Наш Шлях“ Вільня, Віленская, 12.

„Беларускі Сьцяг“ Літва. Kaunas, Senatoriqu 9 - 8.

Беларускі Музэй. Вільня, Вострабрамская, 9.

Віленскі Саюз Кааперататываў Вільня, Малая Погулянка 12.

Беларуская друкарня „Друк“ Вільня, Субач № 2.

Зварочуемся да ўсіх беларускіх арганізацый на сьвеце з просьбаю — прысылаць у гэты аддзел свае адрасы.

Рэдактар-выдавец А. АМЕЛЬЯНОВІЧ. Друкарня „ДРУК“ Субач, 2.